жр 3171
Бібліятэка АН БССР

Смерць нямецкім акупантам!
Комуністычная партыя (большэвікоў) Беларусі.

# Народны мсцівец

Орган Слуцкага РК КП(б)Б
№24—25 | Нядзеля, 22 жніўня 1943 г. | №24—25

**Прачытаў—перадай другому**

У азнаменаванне атрыманых перамог 16 і 84 гвардзейскім стралковым дывізіям, 238 і 369 стралковым дывізіям, вызваліўшым 15 жніўня горад Карачаў, загадам Вярхоўнага Галоўнага камандуючага Маршала Совецкага Саюза таварыша Сталіна прысвоена званне „Карачаўскіх“, і далей яны будуць называцца: 16 Карачаўская гвардзейская стралковая дывізія, 84 Карачаўская гвардзейская стралковая дывізія, 238 Карачаўская стралковая дывізія, 369 Карачаўская стралковая дывізія.



## Да зброі, случчанін!

26 месяцаў совецкі народ вядзе гераічную барацьбу з разбойніцкімі ордамі гітлераўскай арміі. У гэтай барацьбе слаўная совецкія воіны пакрылі свае баявыя сцягі неўміраючай славай.

Гэтым летам Чырвоная Армія нанесла новы сакрушальны ўдар нямецка-фашысцкім захопнікам. Чырвоная Армія, выконваючы план Вярхоўнага Галоўнакамандавання за месяц баёў сарвала наступленне немцаў на Курск, нанесла буйнае паражэнне групіроўцы адборных нямецка-фашысцкіх войск, ліквідавала Орлоўскі плацдарм ворага і вызваліла ад нямецкіх акупантаў гарады Орол, Белгарад, Карачаў і тысячы населёных пунктаў.

Чырвоная Армія пераможна наступае! Зараз ужо кожнаму зразумела, што гітлераўская армія пераможана, але справа толькі ў тым, што гэтага не хоча прызнаць гітлераўская кліка і працягвае бескарысную барацьбу. Нашы саюзнікі нанеслі цяжкі ўдар нямецка-італьянскім войскам у Сіцыліі, поўнасцю ачысціўшы яе ад фашысцкай заразы.

Агнём партызанскай вайны шугае тыл ворага. Шырацца рады народных мсціўцаў, якія наносяць сакрушальныя ўдары па варожых камунікацыях. Папаўся нямецкі кат—ні ўпярод, ні ўзад.

Азлобленыя сваімі няўдачамі гітлераўскія бандыты ўчыняюць нечуваныя зверствы і крывавыя расправы над мірным насельніцтвам. Фашысцкія мярзотнікі нядаўна ўтварылі новую крывавую расправу над мірнымі жыхарамі мястэчка Урэчча, нашага раёна. Яны замучылі звыш 100 жыхароў—мужчын і жанчын, старыкоў і дзяцей. Але яны не паставілі на калені астатніх жыхароў. Астаўшыяся ў жывых урэчцы аб'ядналіся ў партызанскі атрад, каб жорстка і бязлітасна помсціць лютым звярам-немцам.

Працоўныя Случчыны! Немцы хутка будуць адступаць з Беларусі. Яны будуць імкнуцца спаліць усё, угнаць працаздольнае насельніцтва. І мы не павінны дазволіць ім тварыць з намі сваю апошнюю расправу.

Случчанін! Хочаш жыць—падымайся на барацьбу, бярыся за зброю, бі немцаў, а інакш яны заб'юць цябе. Усе ўступайце ў партызанскія атрады! Дапамагайце Чырвонай Арміі хутчэй знішчыць немцаў.

Да зброі, случчанін! Да барацьбы за радасць нашага жыцця, за нашу родную зямлю, за свабоду і шчасце!

Смерць нямецкім акупантам!

## Весткі з фронта

На Бранскім напрамку 15 жніўня нашы войскі, з амаўшы супраціўленне праціўніка, пасля упорных баёў авалодалі г. Карачаў, 16 жніўня пасля жорсткіх вулічных баёў ачысцілі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў г. Жыздру. 18 жніўня на гэтым напрамку нашы войскі прасунуліся ўпярод на 6—10 кілометраў і занялі звыш 40 населёных пунктаў.

На Харкаўскім напрамку нашы войскі, перамагаючы супраціўленне і контратакі праціўніка, прадаўжалі наступленне, за 18 і 19 жніўня прасунуліся ўпярод на 12—22 кілометры і занялі звыш 80 населёных пунктаў, у тым ліку г.г. Змееў і Лебедзін.

## За граніцай

Саюзныя войскі занялі Сіцылію. За час баёў знішчана 35.000 італьянска-нямецкіх салдат і афіцэраў, ўзята ў палон 135.000, збіта 1.013 італьянска-нямецкіх самалётаў, разбіта 622 гарматы і многа танкаў, захоплена саюзнікамі 306 транспартных суднаў праціўніка.

Зараз англійска-амерыканскія марскія сілы падвяргаюць абстрэлу пабярэжжа Італіі. Ліпарскія астравы ўжо капітуліравалі. Саюзная авіяцыя бесперастанку бамбардыруе Рым і другія гарады Італіі.

# Мы сілы падвоім, мы храбрасць патроім, МЫ ВОРАГАЎ ІХ-ЖА КРЫВЁЮ НАПОІМ



Помсціць бязлітасна нямецкім захопнікам за кроў і слёзы нашых жонак і дзяцей, мацярэй і бацькоў, братоў і сёстраў. Усімі сіламі дапамагаць Чырвонай Арміі ў яе барацьбе з подлымі гітлераўскімі прыгнетальнікамі. І. СТАЛІН.

## Рахунак помсты

Падрыўную групу партызанскага атрада т. С. узначальвае вопытны падрыўнік ПятрусьБ. Радка калі знойдзеш Пятруся і яго таварышоў у атрадзе. Амаль увесь час яны дзейнічаюць на чыгунцы. Рахунак іх помсты расце з кожным днём. За апошнія тыдні адважныя падрыўнікі пусцілі пад адкос 7 нямецкіх эшалонаў. Разбіта 7 паравозаў, 63 вагоны і платформы з жывой сілай, тэхнікай і боепрыпасамі.

5 жніўня Пятрусь са сваёй групай спусціў восьмы варожы эшалон. Пры крушэнні разбіт паравоз і 12 платформ з танкамі і самалётамі. Нядаўна падрыўнікі зноў адправіліся на выкананне новай баявой задачы.

ІВАН С.,
партызан энскага атрада.

## Ярасны гнеў узрастае

Случчанін, мой брат і таварыш!
Ты бачыш — краіна ў агні,
Кругом палыхаюць пажары,
І чуецца гром навальніц.
Ты бачыш — фашысцкая зграя
Савецкія гоніць палі,
Разносяцца енкі над краем
І стогны радзімай зямлі.
Усюды нямецкія каты
Справуюць крывавы разгул.
І людзі, кідаючы хаты,
Хавацца ад смерці бягуць.
Ты бачыш — народная сіла
Штодзённа расце ў барацьбе,
І немцы не хлеб, а магілу
Знаходзяць у нас тут сабе.
Фашысцкаму лютаму зверу
Цяпер не схавацца нідзе:
Чырвоная Армія ўперад
Штодзень пераможна ідзе,
І ярасны гнеў узрастае
У варожым тылу ў людзей,
Іх помста заўсёды святая
У баях к перамозе вядзе.
Смялей разгінай свае плечы,
Случчанін, і зброю бяры!
Грамі фашыстоўскую нечысць!
Хай ведаюць немцы — звяры,
Што іх ад народнае сілы
Нічога цяпер не спасе.
На нашай зямлі ў магілы
Фашысцкія каты палягуць усе.

Я. ПРАДВЕСНЫ.

## САБАКАМ—САБАЧАЯ СМЕРЦЬ

На дарозе Слуцк—Мінск імчалася машыны. Пад узмоцненай аховай у іх ехала 7 галоўных бандытаў—новы гебітбандыт г. Слуцка, камендангы і падкамендангы.

Народныя мсціўцы замініравалі дарогу і зрабілі засаду.

Машыны наскочылі на партызанскія міны і ўзляцелі ў паветра. Тут сабе знайшлі магілу гітлераўскія бандыты. З засады партызаны знішчылі ўсю бандыцкую ахову.



Партызанскі рух—народны. Палітычна ён цесна звязаны з усімі праноўнымі Савецкага Саюза.

Партызаны — мсціўцы савецкага народа—будуць старыцай плаціць фашыстам за кожнае зладзейства.

М. КАЛІНІН

## Знішчылі 85 гітлераўцаў

Нядаўна энская партызанская брыгада, ідучы на выкананне баявога задання, на Случчыне сустрэлася з фашысцкім збродам, сілы якога па ўзбраенню і людскому саставу ў некалькі разоў перавышалі сілы брыгады. Нягледзячы на гэта, народныя мсціўцы прынялі бой. Яны заманілі фашысцкую зграю да лесу, падпускалі яе на блізкую дыстанцыю і касілі з аўтаматаў, кулямётаў і вінтовак.

Бой ішоў некалькі гадзін. Ад меткіх партызанскіх куль, як снапы, валіліся фашысцкія бандыты.

Скора партызанскія кулі звалілі з ног двух нямецкіх афіцэраў. Гітлераўцы прышлі ў замяшанне і ў беспарадку адышлі.

У гэтым баю народныя мсціўцы забілі 85 гітлераўцаў.

СЯРГЕЙ Ш.,
партызан энскага атрада.

# Наш помсты віхор імклівы, як гром, гудзе ўначы. АЧЫСЦІМ ДОЛЫ, НІВЫ АД ПРАГНАЙ САРАНЧЫ!

## Бязлітасна помсціць нямецкім разбойнікам за іх злачынствы

### ПІСЬМО ЎРЭЦКІХ ПАРТЫЗАН ДА ПРАЦОЎНЫХ СЛУЦКАГА РАЁНА

Зусім нядаўна мы былі пад ярмом нямецкага панавання. З болем ў грудзях мы бачылі, як фашысцкія варвары знішчаюць усё, што дорага нам. На працягу двух год мы былі сведкамі нябачаных у гісторыі нашага месца трагедый і зверстваў над культурай, гаспадаркай, жыццём людзей, іх пакутамі і маёмасцю. Фашысцкія драпежнікі аграбілі прыгожую станцыю Урэчча. За перыяд свайго „гаспадарання" нямецкія грамілы ліквідавалі школу, клуб, кінотэатр, бібліятэку, пошту, бальніцу і радзільны дом. Велізарныя і цудоўныя пабудовы воінскіх гарадкоў немцы варварскі разбурылі, а частку проста спалілі без усякай прычыны. Урэчцы не бачаць свету за выкананнем усякіх рабскіх павіннасцей для немцаў.

Урэчча, падобна другім гарадам і мястэчкам, ператворана ў мястэчка шыбеніц, гестапаўскай турмы, у зборышча ап'янеўшых ад нарадной крыві гітлераўскіх бандытаў.

Раз'юшаныя няўдачамі на фронце нямецкія людаеды зараз асабліва сталі жорсткія і зверскія. Уначы па мястэчку блукаюць п'яныя орды гітлераўцаў, якія ўрываюцца ў кватэры жыхароў, грабяць і збіваюць іх, гвалтуюць жанчын. Так была згвалтавана цяжарная жанчына Сцепа Х., жонка Івана В. і другія на вачах у дзяцей. Часта ў мястэчку можна бачыць, як шалёны фрыц на кані гоніцца за маладой дзяўчынай па вуліцы ці агародзе, імкнучыся злавіць сваю ахвяру.

Няма граніц злачынствам, якія ўчыняюць гітлераўскія душагубы над мірным насельніцтвам мястэчка.

4 жніўня г.г. гітлераўцы ўтварылі новую крывавую расправу над урэчцамі. Нямецкія каты арыштавалі 25 сямей—звыш 100 чалавек мужчын і жанчын, старыкоў і дзяцей. Назаўтра душагубы расстралялі ўсіх.

Ад рук нямецкіх катаў загінула сям'я інваліда Калпаковага, яго трое малых дзяцей і цяжарная жонка, Заброцкі Аляксандр з жонкай і 7 дзяцей, дацэнт мікрабіялагічных навук Зінаіда Марзон і яе двое дзяцей, Сідарэнка Міхаіл, яго жонка і груднoе дзіця, 65-гадовы Сямён Сідлестравіч і яго 50-гадовая жонка і другія. Бязлітасна расправіліся немцы і з сваімі прыслужнікамі. Яны расстралялі бургамістра Урэцкай воласці Сухана Александра, яго жонку, дачку, сына, сястру, 75-гадовага бацьку і 70-гадовую маці, сакратара воласці—агента гестапа Радкевіча Владзіміра і яго 5 членаў сям'і, тры сям'і паліцэйскіх.

Нельга без слёз перадаць усёй халоднай дзікасці і зверства, з якімі праводзілася гэта крывавая расправа над ні ў чым непавінным мірным насельніцтвам. Мужчын і жанчын расстралялі над ямай, а дзяцей жывымі кідалі ў уборныя і прысыпалі пяском.

Пасля такой расправы над землякамі наша нянавісць вышла з берагоў душы. Ноччу звыш 70 сямей урэчцаў выехала да партызан, пакінуўшы свае родныя дамы, сваю маёмасць. Мы пераканаліся, што ў немцаў няма літасці да нашага народа, што немцы не вызваліцелі, як яны сябе называюць, а знішчальнікі нашага народа.

Цяпер мы арганізаваліся ў партызанскі атрад, каб са зброяй у руках адпомсціць бязлітасна і жорстка за кроў і слёзы сваіх родных землякоў, за смерць сваіх матак, бацькоў, сясцёр, братоў, жонак і дзяцей. Сэрца абліваецца крывёю, рукі зжымаюцца ў кулакі, нянавісцю гарыць сэрца, і мы ў барацьбе з ворагам не будзем ведаць літасці. Будзем граміць паганую нямчуру на кожным кроку.

Працоўныя Случчыны! Няхай горкі ўрок урэчцаў пераканае вас, што больш цярпець нельга, што настаў час расплаты з лютым ворагам за ўсе іх злачынствы.

Законам нашага жыцця павінна быць толькі адно: перамога або смерць. І мы ўпэўнены ў перамозе над нямецкімі акупантамі. Нас упэўняюць у гэтым і натхняюць на барацьбу вялікія франтавыя поспехі Чырвонай Арміі.

Случчане, мы заклікаем вас—бярыце зброю ў рукі, станавіцеся ў рады народных мсціўцаў, каб разам з усім савецкім народам хутчэй ачысціць нашу родную зямлю ад лютых чужынцаў, каб зноў зажыць вольна і шчасліва.

Смерць нямецкім акупантам!

У абмеркаванні пісьма прынялі ўдзел усе партызаны урэцкага партызанскага атрада. Па даручэнню пісьмо падпісалі: Пётр ПРАТАСЕНЯ, Міхаіл РАБАЧУК, Іосіф ДУДЗІЧ, Нікалай САКОЛІЧ, Рая ВІГДОРЧЫК, Ніна БУЦЭЛА.

## НЕПАКОРНАСЦЬ І НЯНАВІСЦЬ

Нямецкія душагубы зверскі замучылі сялянку вёскі Р. Юлю П. Гітлераўцы думалі пакарыць сялян гэтай вёскі, пагасіць у іх лютую нянавісць да нямецкай зграі. Але нічога не выйшла з гэтага ў фашыстаў.

З вёскі з кожным днём усё новыя і новыя патрыёты станавіліся ў рады народных мсціўцаў. Звыш 30 чалавек вёскі пайшлі ў партызаны. Многія з прышоўшых у партызаны займаюць камандныя пасты ў партызанскіх атрадах. Далёка разносіцца слава пра Івана А.—бясстрашнага камандзіра брыгады, пра сям'ю патрыётаў Гурыновічаў і другіх. Юліны аднавяскоўцы жорстка помсцяць катам за залітыя крывёю нашы родныя палі, за мукі нашага народа.

М. Д.

жср 3171



# Мы пранясём сцягоў зару, яе разгорне вецер польны,— і зноў будзе Беларусь квітнець у сям'і народаў вольных!

## Случчына будзе совецкай

Я ніколі не забуду таго дня, калі гітлераўскія азвярэлыя бандыты на рассвеце акружылі нашу вёску С., як шакалы, схапілі больш 40 чалавек, завезлі іх у Слуцк і расстралялі на жураўскім полі. Сярод гэтых фашысцкіх ахвяр былі ні ў чым непавінныя жанчыны, маленькія дзеці і старыкі. Там былі і мае родныя—бацька, маці і сястра з маленькімі дзецьмі. Калі я пачуў аб іх смерці, маё сэрца сціснулася ад болі, уся мая істота загарэлася агнём яраснай помсты.

Фашысцкія людаеды расстралялі майго бацьку, маці, сястру. Цяжкую рану нанеслі яны мне, але гэта зверства не аслабіла маёй злобы, не пагасіла маёй нянавісці да гітлераўскай неабузданай банды, а, наадварот, яшчэ больш узмацніла яе. Супроць гэтых гітлераўскіх бандыцкіх орд змагаюцца разам са мною і мае аднавяскоўцы.

Мы пакляліся жорстка помсціць фашысцкім вырадкам за смерць сваіх родных і блізкіх, за аграбленую Случчыну і маці-Беларусь.

Пераможнае наступленне нашай любімай Чырвонай Арміі ўзмацняе наш дух, натхняе нас на новыя подвігі. Хутка будзе перамога над ворагам. Скора родная Случчына зноў будзе совецкай.

ЦІМОХ Я.,
партызан энскага атрада.

## Пісьмы з совецкага тыла

Партызаны брыгады імені Чкалава вельмі часта атрымоўваюць лісты з совецкага тыла ад сваіх родных, блізкіх і знаёмых.

Калгаснік з Ульянаўскай вобласці Іван Сцяпанавіч—бацька партызана Васіля М.—піша камандзіру партызанскай брыгады: „Перадайце партызанам і партызанкам, якія змагаюцца за чэсць і незалежнасць нашай Радзімы ў варожым тылу, наша гарачае калгаснае прывітанне. Мы дадзім нашай доблеснай Чырвонай Арміі харчаванне, а прамысловасці неабходную сыравіну для хутчэйшага разгрома фашысцкай арміі".

З калгаса „Хваля рэволюцыі", Курганскай вобласці, Анастасія Іванаўна піша свайму мужу—партызану Ларыону: „Калі я чытала твой ліст, дык у мяне ад вялікай радасці цяклі слёзы. Гітлераўскія бандыты не далі людзям пажыць спакойна, шчасліва. Мы не губляем надзеі, што наша Чырвоная Армія на фронце, а вы ў тылу адпомсціце гітлераўскім душагубам за ўсе іх здзекі над нашым народам. Сама я работаю ў калгасе. Скарэй расправуляйся з фашысцкімі разбойнікамі і прыязджай дамоў".

З Сталінградскай вобласці Зіна П. піша свайму мужу Пятру: „Жадаю табе самых лепшых поспехаў у барацьбе з крывавым зверам—нямецкімі захопнікамі".

Сястра камандзіра Аляксея С. з вызваленай ад нямецкіх разбойнікаў тэрыторыі піша: „Дарагі брат, цяжка апісаць тыя дні і часы, калі мы былі ў лапах фашысцкага звера. Пад акупацыяй мы былі тры месяцы і за гэты час перажылі цяжкія мучэнні.

Фашысцкая погань прышла к нам у той час, калі я пачала хадзіць у сёмы клас. Лёша! Як мне крыўдна было, калі вашывыя фрыцы зрабілі з нашай школы канюшню. Праклятыя душагубы не далі мне працягваць вучобу, а таксама жыць у сваёй мясцовасці, у сваім доме. Немцы - паразіты яго спалілі. Яны спалілі ўсю нашу вёску. Але гэта яшчэ не ўсё. Людаеды хацелі знішчыць усё насельніцтва нашай вёскі. Як жывёлу, загналі яны нас у школу і, калі стала падыходзіць наша родная Чырвоная Армія, у шаленстве падпалілі школу з людзьмі і кінуліся ўцякаць. Але нашы доблесныя воіны выратавалі нас ад смерці".

## Здабудзем шчасце ў баях

Як пражорлівая саранча, на нашу багатую Случчыну наляцела фашысцкая зграя. Апустошыўшы нашы квітнеючыя палі, абабраўшы да ніткі случчан, гітлераўскія нягоднікі намагаюцца насельніцтва Случчыны ператварыць у паслушных нямецкіх рабоў. Са звярынай тупасцю твораць яны масавыя крывавыя расправы над мірнымі жыхарамі нашых вёсак, мястэчак і гарадоў.

Некалькі разоў гітлераўскія разбойнікі прыязджалі і ў нашу вёску, забіралі ў сялян апошні хлеб, жывёлу, вопратку. Раз нямецкія бандыты прыехалі на світанні. Усе яшчэ спалі. Яны схапілі 18 сямей—больш 40 чалавек жанчын, падросткаў, малых дзяцей, старыкоў і расстралялі.

Вось ні ў чым непавінныя ахвяры азвярэлых фашысцкіх катаў: 57-гадовы Мурашкевіч Трахім, яго жонка Хвядора і дочкі Марыя, Таня і Валя; 53-гадовая Славашэвіч Адар'я, яе дочкі: Алена, 14-гадовая Маня і 9-гадовая Люба; Васілевіч Наташа і яе маленькія дзеці Жана і Віця, 65-гадовы Ярашэвіч Сямён, яго жонка і дачка з маленькімі дзецьмі і іншыя.

У адказ на крывавыя расправы случчане яшчэ ярчэй раздуваюць полымя народнай помсты.

Каля 40 чалавек з нашай вёскі ўжо ўліліся ў рады народных мсціўцаў і бязлітасна помсцяць нямецкім душагубам за смерць сваіх бацькоў, матак, братоў і сясцёр. Яны на сваім вопыце пераканаліся, што шчаслівае жыццё настане толькі тады, калі ўся наша зямля будзе поўнасцю ачышчана ад фашысцкай чумы.

ІЛЬЯ С.,
партызан энскага атрада.

Выданне Слуцкага РК КП(б)Б  Адказны рэдактар—РЭДКАЛЕГІЯ

Библиотека АН БССР